арыентаванага інфармацыйнага асяроддзя і адзінай інфармацыйнай прасторы. Гэты курс падтрымлівае сістэму шматузроўневай непарыўнай інфармацыйна-тэхналагічнай падрыхтоўкі спецыялістаў культуралагічнага профілю. Засваенне гэтага курса дасць магчымасць падрыхтаваць спецыяліста высокага ўзроўню, які будзе свабодна арыентавацца ў сучаснай інфармацыйнай прасторы.

ЛІТАРАТУРА


1. Кузьмініч Т. В. Інфармацыйная культура асобы: Вучэбны дапаможнік. Мн., 2002.
2. Ромашина С. Я. Дидактические основы формирования культуры коммуникативного воздействия педагога: Учебное пособие для студентов педагогических вузов. Барнаул, 2002.
3. Лапина Н. А. Управление информационной культуры персонала: Автореф. дисс. канд. экон. наук. СПб., 2003.
4. Бураўкін А. Г. Інфармацыйныя тэхналогіі ў мастацтве. Мн., 1999.



*Zhilinskaya T. S.*


*THE INFORMATIONAL CULTURE IS AN OBLIGATORY COMPONENT OF TRAINING SPECIALISTS IN THE SPHERE OF CULTURE*


*The role and contents of information culture in an information society are considered. The basic aspects, methods, means of teaching and conditions of forming information culture of students in the sphere of culture are described.*


## БІБЛІЯТЭКА І ЭКАЛАГІЧНАЯ КУЛЬТУРА ПАДЛЕТКАЎ: ШЛЯХІ ВЫРАШЭННЯ ПРАБЛЕМЫ


**Какшынская В. А.,**
**аспірантка Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў,**
**вядучы бібліятэкар навукова-даследчага аддзела бібліятэказнаўства Нацыянальнай бібліятэкі Беларусі**


Пагаршэнне экалагічнай сітуацыі ў краіне, імкненне атрымаць імгненную выгаду, не турбуючыся аб уроне, які наносіцца прыродзе і грамадству, няведанне і невыкананне прававых норм, заніжэнне маральных каштоўнасцей — гэта і многае іншае выступае паказчыкам нізкай агульнай і асабістай экалагічнай культуры адносін грамадства да навакольнага асяроддзя.

Сувязь экалогіі і культуры відавочная: стан экалогіі адлюстроўвае ўзровень культуры грамадства. Таму без змяненняў у культуры прыродакарыстання нельга разлічваць на пазітыўныя змяненні ў экалогіі. Менавіта культура здольная прывесці ў адпаведнасць дзейнасць чалавека з біясфернымі і сацыяльнымі законамі жыцця.

Культура — гэта тая вобласць чалавечага быцця, у аснове якой ляжаць сэнсажыццёвыя каштоўнасці, якія ў сваю чаргу складаюць фундамент абсалютных, агульначалавечых каштоўнасцей [1, 6]. Катэгорыя «культура» разглядаецца філосафамі і псіхолагамі как спецыфічны спосаб арганізацыі і развіцця чалавечай жыццядзейнасці, які прадстаўлены ў прадуктах матэрыяльнай і духоўнай працы, у сістэме патрабаванняў і норм, у духоўных каштоўнасцях, у сукупнасці адносін людзей да прыроды, паміж сабой і да саміх сябе [2].

У гэтай сувязі экалагічную культуру можна ўспрымаць як высокі ўзровень валодання сістэмай экалагічных ведаў, як ступень развіцця экалагічнай свядомасці і паводзін асобы, ступень удасканалення мэтанакіраванага ўзаемадзеяння чалавека з навакольнай прыродай.

Падлеткавы ўзрост выбраны для даследавання па некалькіх прычынах: у гэты перыяд узнікаюць важкія асабовыя новаўтварэнні, закладваюцца асновы свядомых паводзін, вымалёўваецца агульная накіраванасць у фарміраванні маральных уяўленняў і сацыяльных установак. Для падлеткавага ўзросту характэрна патрэба ў зносінах, самасцвярджэнні, калектыўнай працы па вывучэнню і ахове прыроды. Паводзіны падлетка часта бываюць непаслядоўнымі, магчымы розныя формы іх парушэння і як вынік гэтага — негатыўныя адносіны да навакольнага асяроддзя.

Падлетак, які надзелены экалагічнай культурай, адметны перш за ўсё ўменнем дасягаць гармоніі як са сваім унутраным, так і са знешнім светам. У падлеткавым узросце гэта ўменне фарміруецца ў асноўным праз спецыяльныя веды, развіццё эмацыянальнай сферы і практычных навыкаў экалагічнай дзейнасці. Крытэрыем развіцця экалагічнай культуры падлеткаў з'яўляецца ўменне бачыць і



РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

цаніць прыгажосць прыроды. Духоўныя патрэбы падрастаючага пакалення цесна звязаны з развіц-цём пачуццяў і ўсведамленнем невычэрпнай прыгажосці прыроды. У падлеткаў пераважае грамад-ска карысны тып дзейнасці, які становіцца вядучым у псіхічным развіцці. Таму гатоўнасць, жаданне і рэалізацыя дзеянняў падлеткаў з мэтай вывучэння, паляпшэння стану прыроднага асяроддзя будзе важнейшым крытэрыем развіцця экалагічнай культуры [3].

Экалагічная культура падлеткаў уяўляе сабой цэласную сістэму, якая складаецца з шэрагу ўза-емазвязаных элементаў:

- сістэмы ведаў (прыродазнаўчых, каштоўнасных, нарматыўных, прававых);
- экалагічнага мыслення, якое ўключае ўстанаўленне прычынна-следчых, імавернасных, прагнастычных і іншых відаў сувязей;
- сістэмы перакананняў, якія адлюстроўваюць светапоглядны ўзровень экалагічнай куль-туры;
- сістэмы практычных навыкаў і ўменняў, якія вызначаюць узровень практычнай дзейнасці;
- культуры экалагічна апраўданых паводзін, якія характарызуюцца ступенню ператварэння экалагічных ведаў, мыслення і культуры пачуццяў у паўсядзённую норму, учынкі;
- культуры пачуццяў, якія характарызуюць узровень эмацыянальнай дзейнасці чалавека;
- усведамлення вытокаў, сутнасці і шляхоў рашэння экалагічных праблем, прыняцця рашэн-няў у выпадках маральнага выбару і прагнозу.

Экалагічная сістэма ведаў складае аснову экалагічнай свядомасці; каштоўнасныя арыентацыі і ацэначныя меркаванні звязаны з прыняццем рашэнняў па ахове прыроды; сістэма ведаў набывае характар поглядаў і перакананняў, калі яе развіццё суправаджаецца фарміраваннем пэўных умен-няў і навыкаў, якія ўзмацняюць ацэначныя і матывацыйныя працэсы; экалагічныя паводзіны звязаны з набыццём ведаў аб нормах і правілах паводзін у прыродзе; экалагічная дзейнасць развівае адпа-ведныя адносіны падлеткаў да прыроды.

Вылучаныя кампаненты сведчаць аб тым, што экалагічная культура з'яўляецца інтэгратыўнай якасцю і важнейшай уласцівасцю асобы, якая адлюстроўвае яе псіхалагічную, тэарэтычную і прак-тычную гатоўнасць адказна адносіцца да навакольнага асяроддзя [4].

Паняцці «экалагічная культура», «экалагічная асвета», «экалагічнае выхаванне» непадзельны з дзейнасцю бібліятэк. Валодаючы камп'ютэрнымі тэхналогіямі, унікальным інфармацыйным патэн-цыялам, які ўключае дакументы на друкаваных і электронных носьбітах, велізарным вопытам зада-вальнення патрэб на розную інфармацыю, бібліятэкі становяцца культурна-інфармацыйнымі цэнт-рамі, здольнымі хутка і якасна адклікацца на інфармацыйныя запыты чытачоў па экалогіі. На сён-няшні дзень усё шырэй становіцца ўдзел бібліятэк у рэспубліканскіх і рэгіянальных мерапрыемствах па экалагічнай тэматыцы, акрамя таго, яны самі часта выступаюць ініцыятарамі і арганізатарамі такіх мерапрыемстваў.

Прасачыць дасягненні бібліятэк за апошнія дзесяць гадоў дазваляе правядзенне Нацыянальнай бібліятэкай Беларусі Рэспубліканскіх аглядаў-конкурсаў на лепшую пастаноўку работы бібліятэк па экалагічнай асвеце і інфармаванні насельніцтва, аб'яўленых Міністэрствам прыродных рэсур-саў і аховы навакольнага асяроддзя, Міністэрствам культуры і Міністэрствам адукацыі Рэспублікі Беларусь. Па выніках аглядаў-конкурсаў можна канстатаваць пашырэнне групы ўдзельнікаў-канкур-сантаў, якія шмат гадоў займаюцца экалагічнай асветай на дастаткова высокім узроўні і ўжо каторы раз атрымліваюць прызавыя месцы. Адметныя рысы матэрыялаў, прадстаўленых бібліятэкамі на конкурсы, — іх высокая інфарматыўнасць і якасць афармлення, сістэматызацыя дадаткаў, культура падачы. Конкурсныя работы паказваюць, што рух бібліятэк да новых ступеняў у вобласці экаведаў забяспечваецца рашэннем пэўных задач, галоўнай з якіх застаецца поўнае, шматаспектнае рас-крыццё экалагічнага фонду. Зыходзячы з таго, што фонды дакументаў прыродаахоўнага зместу ў бібліятэках часам недастатковыя, бібліятэкары прыкладаюць шмат намаганняў па пошуку спонса-раў, афармленню грантаў, выкарыстанню пры магчымасці Інтэрнэта. Многія з бібліятэк палепшылі іх якасць дзякуючы рэгіянальным камітэтам прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя, якія ацанілі патэнцыял бібліятэк і сталі аказваць ім фінансавую падтрымку (падпіска на перыёдыку эка-лагічнай арыентацыі, набыццё выданняў навукова-пазнавальнага характару).

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Максімальнаму раскрыццю інфармацыйных рэсурсаў бібліятэк па экалогіі спрыяе пастаяннае папаўненне даведачна-бібліяграфічнага апарата. Амаль паўсюдна яны актуалізаваны рубрыкамі «Экалогія зямлі Беларускай», «Экалогія — зона трывогі», «Абаронім прыроду — абаронім сябе», «Зямля ў небяспецы», «Экалогія нашага краю», «Трывожная інфармацыя» і інш. Прадставіць інфармацыйны патэнцыял па экалогіі дазваляе бібліятэкам выданне ўласных бібліяграфічных дапаможнікаў розных форм — інфармацыйных спісаў, паказальнікаў літаратуры, буклетаў, метадычных дапаможнікаў, дайджэстаў, дасье.

Неабходнасць экалагічнай інфармацыі патрабуе хуткага рэагавання і забеспячэння даступнасці. У гэтай сувязі важным палажэннем закона Рэспублікі Беларусь «Аб бібліятэчнай справе» з'яўляецца забеспячэнне свабоды доступу да інфармацыі, якая ва ўсім свеце прызнаецца адкрытай і не ўяўляе дзяржаўнай або камерцыйнай тайны. Гэта адносіцца перш за ўсё да інфармацыі, якая знаходзіцца ў дзяржаўных інфармацыйных рэсурсах. Яны прызнаюцца адкрытымі і агульнадаступнымі. Становіцца даступнай інфармацыя аб заканадаўчых і іншых нарматыўных актах, надзвычайных сітуацыях, аб дзейнасці органаў дзяржаўнай улады і мясцовага самакіравання, а таксама экалагічная і іншая, якую ўладныя структуры абавязаны прадастаўляць бясплатна. Станоўчай з'явай стала зацвярджэнне Указам Прэзідэнта Рэспублікі Беларусь палажэнняў Орхускай канвенцыі і стварэнне Орхускіх цэнтраў (цэнтраў інфармавання насельніцтва, ствараемых у адпаведнасці з Канцэпцыяй аб доступе да інфармацыі, удзеле грамадскасці ў працэсе прыняцця рашэнняў і доступе да правасуддзя па пытаннях, якія тычацца навакольнага асяроддзя) [5].

На сучасным этапе ўсё часцей практыкуецца выкарыстанне электронных сродкаў у забеспячэнні доступу падрастаючага пакалення да экалагічнай інфармацыі. Шэраг бібліятэк краіны выкарыстоўвае электронныя сістэмы інфармацыі аб заканадаўстве розных краін па прыродакарыстанні і ахове навакольнага асяроддзя, якія даступны праз Інтэрнэт. Варта адзначыць работу такіх шматлікіх расійскіх інфармацыйна-прававых сістэм, як «Консультант+», «Кодекс», «Гарант» і інш. [6]. Развіццё новых тэхналогій, папаўненне фондаў бібліятэк дакументамі на розных носьбітах (відэафільмы, кампакт-дыскі, камп'ютэрныя праграмы, электронныя базы даных) дазваляюць больш поўна задаволіць патрэбы падлеткаў у экалагічнай інфармацыі, прыцягнуць іх, заахвоціць да практычных дзеянняў па паляпшэнню стану навакольнага асяроддзя.

Якасны крок наперад зроблены ў вобласці інфармацыйнага забеспячэння эколага-асветніцкай дзейнасці праграмнымі распрацоўкамі. Гэта даволі эфектыўная форма работы ў дапамогу рашэнню многіх надзённых экалагічных праблем грамадства. Праграмы ахопліваюць цэлы комплекс дзейнасці па распаўсюджанню экалагічных ведаў сярод розных груп насельніцтва і асабліва падлеткаў і накіраваны на аб'яднанне ў працы афіцыйных і дабрачынных арганізацый, грамадскіх рухаў, праваых устаноў, сродкаў масавай інфармацыі. Заслугоўваюць увагі такія праграмы, як «Экалагічная асвета і інфармаванне насельніцтва ва ўмовах публічнай бібліятэкі» (Нацыянальная бібліятэка Беларусі), «Экас» (Барысаўская гарадская цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма), «Бібліятэка і экалогія» (Лельчыцкая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма), «Экалогія і здароўе чалавека» (Рэчыцкая цэнтралізаваная бібліятэчная сістэма), «Экалогія і падлетак» (Мірская раённая цэнтралізаваная сістэма). Рэалізацыя праграм дазваляе павысіць узровень экалагічнай культуры падлеткаў, садзейнічае развіццю і ўкараненню прыродаахоўных тэхналогій, што ў сваю чаргу спрыяе стабілізацыі працэсаў матэрыяльнага і духоўнага жыцця грамадства.

У арсенале актыўных форм дзейнасці бібліятэк па фарміраванню экалагічнай культуры падлеткаў — арганізацыя і правядзенне фестываляў, інфармацыйных кампаній і акцый, Дзён інфармацыі; арганізацыя выставак-праглядаў, вернісажаў мясцовых мастакоў, конкурсаў малюнкаў на экалагічную тэматыку; правядзенне займальна-пазнавальных гульняў, экскурсій па кніжных абшарах бібліятэк і непасрэдна на прыроду; афармленне інфармацыйных стэндаў; размяшчэнне інфармацыі ў Інтэрнеце і інш.

Сярод найбольш эфектыўных форм гульнёвай дзейнасці падлеткаў неабходна адзначыць ролевую экалагічную гульню. Прымяненне яе бібліятэкарамі ў рабоце паказала ўстойлівы інтарэс падлеткаў да гэтай формы гульнёвай дзейнасці. Гэта тлумачыцца тым, што сюжэтна-ролевае мадэляванне адпавядае асноўным патрабаванням падлеткавага ўзросту. Тут і зносіны з равеснікамі, і магчы-

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

масць сцвердзіць сваю самастойнасць, незалежнасць, асабовую аўтаномію, і прызнанне дарослымі. Для падлеткаў гэта становішча найбольш актуальна, таму што ў дадзеным узросце яны, па-першае, страчваюць магчымасць гуляць у многія гульні, даступныя ў дзяцінстве, па-другое, у іх абвастраецца пачуццё незалежнасці, жаданне быць самастойнымі, свабоднымі. Ролевая экалагічная гульня больш чым якая-небудзь іншая адпавядае гэтым жаданням [7].

Адна з задач, якую клапатліва вырашаюць бібліятэкі, — афармленне інтэр'ера. Тут прыходзіцца праяўляць шмат выдумкі і творчасці. Бібліятэкі, якія маюць дастатковую плошчу, ствараюць экалагічныя залы, куткі. У гэтых рэкрэацыйных зонах чытачоў асабліва прываблівають выставы і тэматычныя паліцы. Пры некаторых бібліятэках ствараюцца і плённа працуюць экалагічныя цэнтры, клубы, таварыствы аматараў прыроды. Значную ролю ў прапагандзе экалагічнай культуры падлеткаў адыгрываюць сродкі масавай інфармацыі, з дапамогай якіх публікуюцца спісы новай літаратуры, асвятляюцца масавыя мерапрыемствы, супрацоўнікі бібліятэк прымаюць удзел у тэле- і радыёперадачах экалагічнай накіраванасці.

Вялікую ролю ў фарміраванні экалагічнай культуры падрастаючага пакалення адыгрываюць інтэлектуальныя рэсурсы — прафесійна падрыхтаваныя супрацоўнікі бібліятэк, якія валодаюць дакументальнымі крыніцамі па экалогіі, тэхналогіямі іх распаўсюджвання сярод дзяцей. У сістэме павышэння кваліфікацыі кадраў амаль ва ўсіх рэгіёнах краіны праходзяць навукова-практычныя канферэнцыі, семінары, трэнінгі, форумы, круглыя сталы. Гэта садзейнічае не толькі павышэнню экалагічнай адукаванасці бібліятэкараў, але і стварае платформу больш цеснага кантакту з дзяржаўнымі і грамадскімі арганізацыямі, органамі кіравання. У апошні час прадпрымаюцца крокі да пераходу бібліятэк на новыя формы адукацыі, заснаваныя на прымяненні інфармацыйна-камунікатыўных тэхналогій: віртуальныя семінары і канферэнцыі, віртуальныя школы і арганізацыя экалагічных таварыстваў.

Аналіз работы бібліятэк з падлеткамі-чытачамі па фарміраванні экалагічнай культуры дае магчымасць вызначыць асноўныя кірункі дзейнасці, сярод якіх:

- стварэнне сістэмы садзейнічання фарміраванню экалагічнай культуры і інфармаванню падрастаючага пакалення (канцэпцыі, планы, праграмы, праекты работы бібліятэк ў гэтым кірунку);
- якаснае і сістэматычнае папаўненне інфармацыйных рэсурсаў дакументамі экалагічнай накіраванасці;
- развіццё сістэмы даведачна-бібліяграфічнага абслугоўвання насельніцтва, стварэнне баз даных, інфармацыйных цэнтраў па экалогіі і Орхускіх цэнтраў;
- інфармаванне падрастаючага пакалення аб экалагічным палажэнні рэгіёна, у тым ліку прадстаўленне звестак, якія тычацца радыяцыйнай бяспекі;
- інфармацыйнае супрацоўніцтва з тэрытарыяльнымі органамі Міністэрства прыродных рэсурсаў і аховы навакольнага асяроддзя Рэспублікі Беларусь, кіраўнікамі прадпрыемстваў, іншымі арганізацыямі ў вобласці экалогіі;
- узаемадзеянне з арганізацыямі, якія маюць экалагічны кірунак дзейнасці для выкарыстання матэрыялаў аб іх дзейнасці ў мэтах экалагічнай інфармаванасці карыстальнікаў;
- сістэмнасць у вывучэнні і развіцці чытацкіх патрэб падлеткаў шляхам удасканальвання методыкі абслугоўвання (індывідуальныя і масавыя формы);
- распрацоўка і ўкараненне, рэалізацыя інавацыйных форм індывідуальнай і масавай работы з падлеткамі па фарміраванню ў іх экалагічнай культуры;
- удасканаленне зместу, форм і тэхналогій павышэння кваліфікацыі супрацоўнікаў бібліятэк (тэматычныя семінары, спецыяльныя курсы, стажыроўкі і іншыя формы экалагічнай адукацыі).

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ

## ЛІТАРАТУРА

1. Воспитание экологической культуры у детей и подростков: Экологические занятия. Сюжетно-ролевые игры. Сценарии литературно-экологических праздников / Н. С. Дежникова и др. М., 2000.
2. Кашлев С. С. Организация эколого-педагогической деятельности — фактор устойчивого развития общества // Адукацыя і выхаванне. 2004. № 3. С. 10–20.

3. Филинов А. В. Взаимосвязь учебной и внеучебной работы как фактор развития экологической культуры подростков: Автореф. дис. ... канд. пед. наук: 13.00.01. Бурятский гос. ун-т. Улан-Удэ, 2004.
4. Гладышева Л. Ю. Муниципальная система непрерывного экологического образования как условие развития экологической культуры учащихся: автореф. дис. ... канд. пед. наук: 13.00.01. Санкт-Петербург. гос. ун-т пед. мастерства. Санкт-Петербург, 1999.
5. Ермак А. А. Доступность экологической информации: поиск новых решений // Мир библиографии. 2006. № 6. С. 2–3.
6. Куприянов Б. В. Ситуационно-ролевая игра в социальном воспитании старшеклассников / Б. В. Куприянов, А. В. Подобин. КГПУ, 1998.

***Kakshinskaya V. A.***

*LIBRARY AND THE ENVIRONMENTAL CULTURE OF TEENAGERS: WAYS OUT*

*A special role in ecological security system belongs to the information-documental resosures of libraries. Libraries are seriously engaged in forming ecological culture and bringing-up teenagers. The specific activity of public libraries allows to produce continual and a systematical process of the ecological bringing-up. The libraries closely cooperate with organizations, public movements, in realization of long-term target programs, projects and participate in various competitions.*

РЕПОЗИТОРИЙ БГУКИ